# Правапіс раздзяляльных знакаў



**АНТАНОВІЧ**
**Наталля Міхайлаўна**
выкладчык кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка

## Правапіс апострафа

Знаёмства з тэмай **«Правапіс апострафа»** мэтазгодна пачаць з вымаўлення і ўспрымання на слых вучнямі слоў з апострафам і без яго. Для гэтага можна выкарыстаць наступнае практыкаванне.

➢ Прачытайце верш. Вымавіце выдзеленыя словы парамі. У якім слове паміж зычным і галосным вымаўляецца гук **[й’]**? Назавіце па парадку гукі ў выдзеленых словах.

*А зараз ад* ***сямі*** *—*
*Ад тыдзеньскай* ***сям’і*** *—*
*Два дні мы адымаем —*
*І ўсе адпачываем!*
*Субота і нядзеля —*
*Вясёлыя падзеі!* В. Зуёнак.

У выніку праведзенага фанетычнага аналізу вучні робяць вывад аб тым, што словы адрозніваюцца наяўнасцю або адсутнасцю гука **[й’]** пасля зычнага. Гук **[й’]** не дае зычнаму зліцца з галосным, ён іх раздзяляе. На пісьме **[й’]** і галосны гук абазначаюцца адной літарай. Пасля літары, якая абазначае цвёрды зычны гук, ставіцца апостраф.

Для выпрацоўкі ўмення правільна пісаць словы з апострафам малодшым школьнікам можна прапанаваць наступныя практыкаванні і заданні займальнага характару.

➢ Прачытайце каламбур. У якім слове на месцы пропуску паміж зычным і галосным вымаўляецца гук **[й’]**? Дапішыце, калі неабходна, у словы апостраф.

*Шкоднікі*
*Зноў трывогу, Вера,* ***б..і,***
*Дзяўбуць вішню* ***вераб..і****.* У. Мацвеенка.

Чаму паэт называе вераб’ёў шкоднікамі?

➢ Прачытайце загадку. Дапішыце слова-адгадку.

*Свята вясны*
*У паднеб..і б..е гармата,*
*І вясна святкуе свята.*
*Нават рэха*
*За бугром*
*Павітала*
*Першы ______.* Н. Сторажава.

Устаўце патрэбны знак у словы. Растлумачце яго правапіс.

➢ Прачытайце прыказкі. Чаму так гавораць?

*Як зварыш, так і з..ясі.*
*На бязрыб..і і рак рыба.*

Назавіце ўсе гукі ў словах з пропускамі. Дапішыце, калі неабходна, у словы апостраф. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

➢ Прачытайце скорагаворку. Навучыцеся правільна вымаўляць яе.

*Улетку ў Ліны мядзведзь з..еў маліны.* А. Клышка.

Які знак трэба ўставіць у слова? Запішыце скорагаворку па памяці.

➢ Прачытайце загадку. Злучыце літары, каб атрымалася слова-адгадка.

*Ненажэра гэты з..есці*
*Можа ўсё на свеце.*
*А нап..ецца ён вады —*
*Памірае ўміг тады.*
М. Пазнякоў




Устаўце патрэбны знак або літару. Растлумачце свой выбар.

➢ Прачытайце народную прыкмету. Якое слоўнікавае слова сустрэлася ў ёй? Што трэба ўставіць у слова замест кропак? Растлумачце.

*Вераб..і дружна чырыкаюць — будзе адліга.*

Запішыце народную прыкмету пад дыктоўку настаўніка.

➢ Сярод прапанаваных літар знайдзіце словы з апострафам. Запішыце іх:

*камп’ютарп’есаб’ездбур’янаб’ёмвераб’інтэр’ер*

Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

➢ Разгадайце крыжаванку. У кожным слове павінен быць апостраф. Апостраф і літару, пасля якой ён ставіцца, пішыце ў адной клетачцы.




1. Паведамленне, якое даводзіцца да ўсеагульнага ведама.
2. «Вопратка» птушак.

3. Група зорак на небе.

4. Група людзей, якая складаецца з мужа, жонкі, дзяцей.

5. Гутарка з карэспандэнтам па пытаннях.

6. Невялікія птушкі з карычнева-шэраватым апярэннем.

7. Стан атмасферы ў пэўны час у пэўным месцы.

***Словы для даведкі**: вераб'і, аб'ява, інтэрв'ю, сям'я, сузор'е, пер'е, надвор'е.*

У крыжаванцы зафарбуйце слоўнікавыя словы.

➢ Прачытайце тэкст. Што трэба ўставіць у словы? Чаму?

*Стаіць халоднае надвор..е. Дзеці павесілі кармушкі для птушак. Першымі заўважылі сталовую вераб..і. Потым з..явіліся сініцы. Частымі гасцямі былі каля кармушак снегіры. У снегіра прыгожае пер..е.*

Выпішыце словы з пропускамі. Рыскамі (|) падзяліце іх для пераносу.

➢ Прачытайце тэкст. Якую літару або знак неабходна ўставіць у словы? Растлумачце.

*У мяне ёсць маленькі папугай. Пер..е ў яго прыгожае. Ён есць зярняткі і п..е ваду.*

Спішыце сказы. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца апостраф.

## Правапіс раздзяляльнага мяккага знака

Вывучэнне тэмы **«Правапіс раздзяляльнага мяккага знака»** неабходна пачынаць з фанетычнага аналізу слоў з раздзяляльным мяккім знакам і без яго.

Другакласнікам можна прапанаваць наступнае заданне.

➢ Вымавіце словы парамі. У якіх словах пасля мяккага зычнага гука вымаўляецца **[й']**?

*коле — калье*
*салю — салью*
*палю — палью*

Вучні заўважаюць, што на пісьме **[й']** разам з галосным гукам абазначаецца адной літарай. Пасля літары, якая абазначае мяккі зычны гук, пішацца раздзяляльны мяккі знак.

Наступныя займальныя практыкаванні і заданні дапамогуць выпрацаваць уменне пісаць словы з раздзяляльным мяккім знакам, размяжоўваць словы з раздзяляльным і змякчальным мяккім знакам.

➢ Прачытайце верш. У якія словы трэба ўставіць раздзяляльны мяккі знак замест кропак?

*Л..ецца на л..ён*
*Цэлы **міл..ён**.* Н. Сторажава.

Спішыце. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны мяккі знак. Вымавіце па парадку гукі, назавіце літары ў выдзеленым слове.

➢ Прачытайце лічылку. Якую літару неабходна ўставіць замест пропускаў? Растлумачце.

*Запытала мама ў Кол..кі,*
*Лап у школьнай ёлкі кол..кі.*
*Палічыў на пал..цах ён*
*І сказаў:*
*— Амаль міл..ён.* П. Сушко.

Устаўце ў словы патрэбную літару. Падкрэсліце словы з раздзяляльным мяккім знакам.

➢ Складзіце «лесвіцу» слоў. Растлумачце напісанне раздзяляльнага мяккага знака ў словах.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | л | ь | ё | н |
| | | | | | | | | |
| | | | | | | | | |
| | | | | | | | | |

***Словы для даведкі:** паштальён, медальён, мільён.*

➢ Прачытайце. Што трэба ўставіць у словы: раздзяляльны мяккі знак ці апостраф? Растлумачце.

*Кан..ён, батал..ён, біл..ярд, міл..ярд, кал..е, парц..е.*

Спішыце. Падкрэсліце літары, паміж якімі пішацца раздзяляльны мяккі знак.

➢ Прачытайце загадку. Злучыце літары, каб атрымалася слова-адгадка.

*Мур у лесе таямнічым,*
*жыхароў — ніхто не злічыць.*
*Завіхаюцца **міл..ёны***
*ў працы дзеля абароны.*
*Кожны — **піл..ны** і адважны.*
*А завецца мур...* У. Мазго.

| | | | |
|---|---|---|---|
| *м* | *р* | *а* | *н* |
| *у* | *ш* | *і* | *к* |

Назавіце гукі ў выдзеленых словах. Устаўце патрэбную літару замест пропускаў. Падкрэсліце словы з раздзяляльным мяккім знакам.

➢ Прачытайце тэкст. Якую літару або знак неабходна ўставіць замест пропускаў? Назавіце словы з раздзяляльным мяккім знакам.

*З раніцы л..е дождж. Мален..кая Ул..янка чакае паштал..ёна. Ён прынясе дзяўчынцы піс..мо ад сяброўкі.*

Спішыце першыя два сказы. Падкрэсліце словы з раздзяляльным мяккім знакам.

На замацаванне правапісу слоў з раздзяляльнымі знакамі можна прапанаваць наступныя практыкаванні.

➢ Прачытайце і адгадайце загадку. Якую літару або знак трэба ўставіць замест пропускаў? Растлумачце.

*Адзін л..е,*
*Другі п..е,*
*Трэці расце.*

Спішыце загадку. Устаўце замест пропускаў апостраф або раздзяляльны мяккі знак.

➢ Прачытайце словы. Растлумачце напісанне вялікай літары.

*Ул..яна, Дар..я, Лук..ян, Іл..я, Мар..яна.*

Спішыце. Устаўце раздзяляльны мяккі знак або апостраф. Растлумачце свой выбар.

➢ Прачытайце загадку-анаграму. Запішыце словы-адгадкі.

Перад заданнем неабходна патлумачыць вучням, што **анаграма — гэта слова, утворанае шляхам перастаноўкі літар іншага слова**.

*Стане першым навасёлам*
*Гэта хатняя жывёла.*
*Прачытай яе назад —*
*Электрычны б..е зарад.*
______ ______ У. Мазго.

Устаўце замест пропуску патрэбную літару або знак.

➢ Прачытайце сказы. Устаўце раздзяляльны мяккі знак або апостраф.

*У нас дружная сям..я.*
*У матулі прыгожае кал..е.*
*Паштал..ён прынёс газеты.*
*Стаіць сонечнае надвор..е.*

Падзяліце словы з раздзяляльнымі знакамі рыскамі (|) для пераносу.